инфраструктуры и в то же время создание уникального имиджа. Культура есть явление не только многовековое, мощное и каждому необходимое, но и хрупкое. Культура, олицетворенная и в красоте, и в знании, и в с в памятниках быта, многообразна и безгранична, а потому поле служения ей тоже бескрайне и благотворно... Главное назначение культуры состоит в ее постоянном содействии духовному развитию человека, раскрытию его талантов, дарований, способностей... А сохранение культурно-исторического наследия, поддержание самобытных культур разных народов, установление духовных интересов личности, сохранение памятников культуры, представляющих художественную ценность – вот проблемы, которые на сегодняшний день приобрели уже характер всемирных и глобальных.

*ЯстрабФ.А.*

## „МАСТАЦКАЯ ВЫСТАВА ЯК СРОДАК ВЫХАВАННЯ ЭКАЛАГІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ”

Тэхнагенныя формы сучаснай цывілізацыі вымагаюць усё часцей звяртаць увагу на незваротныя наступствы іх уздзеяння на навакольны свет. Агрэсіўнасць тэхнапрамысловых структур узмацняецца разбуральнымі неадэкватнымі дзеяннямі чалавека, што часта абумоўлена нізкай экалагічнай свядомасцю, драпежніцкімі, спажывецкімі адносінамі да прыроды. Знішчаючы навакольны свет, змяншаючы яго біялагічную разнастайнасць, чалавек няўмольна рухаецца да таго стану, калі з усёй вастрынёй паўстане пытанне аб існаванні самога чалавека як біялагічнага віду. Таму выхаванне экалагічна свядомага, культурнага чалавека – адна з найважнейшых задач XXI стагоддзя.

Цяжка пераацаніць ролю адукацыі, навукі, культуры, СМІ ў выкананні такой задачы. Надзвычай важкі ўклад у гэтую справу можа ўнесці мастацтва, у прыватнасці, выяўленчае. Даўно заўважана, што чалавек лепш засвойвае інфармацыю пры эмацыянальным уздзеянні, у вобразных формах. Самыя глыбокія ідэі, выказаныя сродкамі мастацтва, усведамляюцца лягчэй і запамінаюцца надоўга. Таму не выкарыстаць такі мацнейшы рычаг уздзеяння было б недазваляльнай раскошай.

Каб быць больш канкрэтнымі, назавем некаторыя формы прымянення мастацтва ў выхаванні экалагічнай культуры. Гэта і граматнае рашэнне гарадскога асяроддзя, і эстэтычна аформленая экалагічная



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэклама, і паркавая скульптура, і правядзенне экалагічных фестываляў, пленэраў...

Засяродзім Вашу ўвагу на адной з самых дзейсных формаў уплыву выяўленчага мастацтва на фарміраванне экалагічнай культуры – мастацкай выстаўцы. Менавіта выстаўка як мабільная структура можа і павінна мець ясна акрэсленую экалагічную ідэю, а таму і характар яе ўздзеяння будзе дакладна адрасаваны і мэтанакіраваны.

Асноўнай мэтай мастацкай выставы экалагічнага характару павінна быць выхаванне ў чалавеку пачуцця еднасці з прыродай, з навакольным светам, гарманічнага з ім суіснавання, пазбаўленне драпежніцка-спажывецкіх інстынктаў у адносінах з прыродай.

Выстава можа ставіць і больш канкрэтныя пытанні, якія і вызначаць характар экспазіцыі, яе тэматыку. Скажам, на восень 2003 года мастацкай галерэяй БДУ культуры запланавана мастацкая выстава „Браты нашы меншыя".Сама назва выставы вызначае асноўную тэму – тэму адказнасці чалавека за прыручаных ім жывёл. Гэта толькі адна тэма, аднак яны могуць быць самыя розныя: чарнобыльская катастрофа, стан запаведнікаў і нацыянальных паркаў, забруджванне асяроддзя, знішчэнне рэдкіх відаў птушак, выхаванне пачуцця прыгожага і г.д.

У залежнасці ад канкрэтных задач выстава можа быць стацыянарнай і перасоўнай. Прынамсі, перасоўная выстава, хоць і звязаная з дадатковымі выдаткамі, усё ж з'яўляецца больш дзейснай, бо ахоплівае большую аўдыторыю. Пажадана, каб такія выставы праходзілі не толькі ў сталіцы, абласных цэнтрах, але і ў раёнах, асабліва з цяжкай экалагічнай абстаноўкай.

Трэба зазначыць, што сама па сабе выстава без добра наладжанай, прадуманай працы над рэалізацыяй ідэй праекта, без шырокага наведвання выставы, асвятлення яе працы ў СМІ можа і не стаць сапраўды эфектыўным сродкам экалагічнай прапаганды. Але на ўсё гэта трэба грошы.

Перш чым падумаць, дзе іх узяць, трэба скласці каштарыс выдаткаў на выставу, які абавязкова павінен уключаць:

– расходы на аплату куратара, менеджэра, адміністратара, тэхнічнага персаналу;

– расходы на аплату дызайну выстаўкі;

– расходы на матэрыялы;

– расходы на транспарт;

– расходы на дызайн і друк рэкламна-інфармацыйных матэрыялаў (афішы, запрашальныя білеты, каталог, інфармацыйны бюлетэнь і г.д.);

– расходы на здымкі відэафільма;

– расходы на рэкламу (вонкавую).

Зразумела, што гэта асноўныя расходы. У залежнасці ад формы і тэмы выставы каштарыс можа ўключаць і іншае.

Вызначыўшы агульны кошт праекту, важна акрэсліць асноўныя крыніцы фінансавання. Гэта могуць быць гранты разнастайных фондаў, міжнародных экалагічных арганізацый, ААН. Можна звярнуцца за дапамогай у Міністэрства прыродных рэсурсаў, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Міністэрства культуры. Безумоўна, трэба шукаць спонсараў і сярод буйных прадпрыемстваў і камерцыйных фірмаў і банкаў.

Вырашыўшы праблему фінансавання выставы, трэба больш дакладна заняцца зместам і формай экспазіцыі. Экспанавацца на выставе могуць самыя разнастайныя творы мастацтва:

а) акварэль,
б) графіка,
в) жывапісныя палотны,
г) габелены, ткацтва, кераміка,
д) скульптура,
е) аб'екты,
ж) інсталяцыі, ассамбляты,
з) мастацкае фота,
і) відэа-арт,
к) творы канцэптуальнага характару.

Надзвычай важным сродкам выхавання экалагічнай свядомасці могуць быць даволі папулярныя раней выстаўкі плаката на экалагічную тэматыку. З сучасных формаў мастацтва можа быць цікава выкарыстаны на выставе перформанс, які сваёй дзеяй мог бы паслужыць інтэлектуальна-правакуючай асновай праекту.

Нам падаецца неабходным уключаць у экспазіцыі такога кшталту асобным блокам інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы (дакументы, фатаграфіі, копіі распараджэнняў, характарыстыкі небяспечных аб'ектаў і г.д.). Дзве часткі экспазіцыі – мастацкая і інфармацыйна-аналітычная – нададуць выставе адкрыты дынамізм і яскравы кантраст двух спосабаў асэнсавання праблемы – на мове факта, дакумента, навукі і на мове мастацкіх увасабленняў, эмацыянальна перажытых вобразаў.

Выхаванне экалагічнай культуры пачынаецца не ў студэнцкіх аўдыторыях і нават не за школьнай партай, а з самага маленства, з самых першых крокаў чалавека. З гэтага вынікае важнасць усведамлення таго, як жа гэты маленькі чалавек сам рэагуе на навакольны свет, як адчувае прыгажосць гэтага свету і небяспеку яго разбурэння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Таму лічым пажаданым уключаць у мастацкія выставы экалагічнага напрамку і блок дзіцячых малюнкаў. Ён можа надаць усёй выставе так неабходную непасрэднасць і вастрыню адчування драмы ўзаемаадносін чалавека і прыроды.

Безумоўна, ажывіла б выставу, унесла б свой моцны эмацыянальны акорд выкарыстанне на выставе тэлевізара, па якім падчас выставы дэманстраваліся б відэафільмы экалагічнай тэматыкі.

Для ўзмацнення эмацыянальнага ўздзеяння на гледача можна выкарыстаць і фанаграму з запісам прыродных гукаў, спевамі птушак.

Каб выстава магла мець шырокі выхаваўча-асветніцкі эфект, трэба ажыццявіць цэлы шэраг суправаджальных мерапрыемстваў. Усе яны могуць быць аб'яднаныя ў наступныя блокі: інфармацыйна-рэкламны, арганізацыйна-асветніцкі, навукова-аналітычны.

Да інфармацыйна-рэкламнага блоку мы аднясем:

– выданне афішы, каталога;

– выданне плакатаў з рэпрадукцыямі карцін на экалагічную тэматыку;

– выданне набора паштовак з рэпрадукцыямі твораў;

– падрыхтоўка артыкулаў аб выставе ў прэсе;

– інтэрв'ю на радыё і тэлебачанні, прысвечаныя тэме выставы.

Арганізацыйна-асветніцкі блок можа ўключаць:

– арганізацыю экскурсій па выставе;

– здымкі відэафільма на тэму выставы і яго дэманстрацыя;

–арганізацыю працы на выставе студэнтаў экалагічных спецыяльнасцяў ВНУ;

– рэалізацыю на выставе літаратуры экалагічнай тэматыкі;

– арганізацыю сустрэч студэнтаў і школьнікаў з мастакамі – удзельнікамі выставы.

Навукова-аналітычны блок перш за ўсё ўключае ў сябе наступнае:

– падрыхтоўку і правядзенне навукова-практычнай канферэнцыі;

– выданне матэрыялаў навукова-практычнай канферэнцыі;

– арганізацыю сустрэч студэнтаў і школьнікаў з вядомымі эколагамі і прадстаўнікамі прыродаахоўчых арганізацый;

–падрыхтоўку і афармленне інфармацыйна-аналітычнага блоку выставы (дакументы, фота і г.д.).

Рэалізацыя ўсіх гэтых спадарожных выставе акцый і мерапрыемстваў надасць экалагічнаму праекту сапраўды моцнае гучанне і шырокі рэзананс у грамадстве.

З вышэй нагаданага бачна, які вялікі патэнцыял эколагаасветніцкага характару можа несці мастацкая выстава. Выкарыстанне

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

ўсяго спектру эмацыянальна-інтэлектуальных магчымасцяў сучаснага мастацтва ў выхаванні экалагічнай культуры чалавека, гарманічных адносін з навакольным светам – задача не толькі мастакоў, творчых аб'яднанняў, галерэй, а перш за ўсё прыродаахоўчых арганізацый, фондаў, ведамстваў... урэшце, кожнага з нас, людзей, якім наканавана жыць у час тэхнагенных катастроф і высокіх тэхналогій.

*Няборская А.В.*

## ЗАХОДНЕЕЎРАПЕЙСКІЯ СТЫЛІ: КУЛЬТУРНЫ ЎПЛЫЎ НА РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАГА МАСТАЦТВА Ў XVII – пач. XIX стст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларуская культура ніколі не развівалася ізалявана. З рускай і украінскай культурамі яе звязвае як адзінства культурна-этнічнага субстрата (славянскі этнас, агульная старажытнаславянская мова, старажытнаруская культура), так і ў значнай ступені рэлігійна-ідэалагічная супольнасць (перавага ўсходняй, ці праваслаўнай разнавіднасці хрысціянства, якое займала адно з важнейшых месцаў у сістэме духоўных каштоўнасцей X – XVIII стст.). З Літвой і Польшчай Беларусь XVI – XVIII стст. была звязана агульнасцю дзяржавы: Вялікае княства Літоўскае, якое ўключала Беларусь, Літву, частку Украіны, з канца XVI ст. аб'ядналася з Польшчай у дзяржаву федэратыўнага тыпу – Рэч Паспалітую. Тэрытарыяльнае, палітычнае, часткова і эканамічнае адзінства трох народаў абумовіла агульнасць многіх аспектаў іх культуры: (архітэктура, манументальнае выяўленчае мастацтва, музыка, сістэма сярэдняй і вышэйшай адукацыі былі агульным здабыткам народаў і этнічных груп, аб'яднаных у адзінай дзяржаве).

Безумоўна, ужо ў эпоху Рэнесанса ўзніклі пэўныя элементы беларускай нацыянальнай культуры, асабліва ў галіне літаратуры, мастацтва, грамадска-палітычнай і філасофскай думкі. Так, літаратурная і асветніцкая дзейнасць Францыска Скарыны, Васіля Цяпінскага, Лаўрэнція Зізанія, Мялеція Сматрыцкага, Афанасія Філіповіча і некаторых іншых пісьменнікаў і мысліцеляў адлюстравала пачатковую стадыю станаўлення беларускай нацыі. Разам з тым іх дзейнасць праходзіла ў межах Вялікага княства Літоўскага, аб'яднанага уніяй з Польшчай у складзе Рэчы Паспалітай, такім чынам, не можа быць не заўважанай у гісторыі культуры Літвы і Польшчы.